*Тэхнічнае заданне*

# Даследаванне стану донарскай дапамогі для беларускай грамадзянскай супольнасці ў межах праграмы *«Belarus Beehive 2.0: Supporting civil society is a key driver of democratic transformation of Belarus»*

## Кантэкст

Праграма «Belarus Beehive 2.0: Supporting civil society key driver of democratic transformation of Belarus» арыентавана на рэарганізацыю і ўзмацненне грамадзянскай супольнасці Беларусі для пашырэння яе магчымасцяў уплываць на дэмакратычныя змены ў Беларусі. Belarus Beehive за кошт набору інструментаў праграмы (кансалтынг у арганізацыйным развіцці, забеспячэнне адукацыі, ментарынг і коўчынг, фінансавая падтрымка рэалізацыі праектаў, інстытуцыйная фінансавая падтрымка, падтрымка кааліцый і г. д.) імкнецца змяніць цяперашні стан грамадзянскай супольнасці Беларусі, у прыватнасці, палепшыць яе чалавечы і арганізацыйны патэнцыял, пашырыць яе доступ да фінансавых сродкаў, павялічыць яе магчымасці адвакатаваць пытанні змен у Беларусі на міжнародным, рэгіянальным і нацыянальным узроўні.

*Праграма разлічана на 2,5 года (30 месяцаў).*

## Мэты і задачы даследавання

1. Даць апісанне і ацэнку стану знешняй донарскай дапамогі беларускай грамадзянскай супольнасці

2. Даць кіраўніцтву Belarus Beehive рэкамендацыі наконт змены дзеянняў, інструментаў, падыходаў Belarus Beehive ў дачыненні да грамадзянскай супольнасці, якія будуць спрыяць больш эфектыўнай адвакацыі і ўцягнутасці грамадзянскай супольнасці ў гэты працэс.

## Аб’ект даследавання: што мы хочам даведацца?

- трэнды ў аб’ёмах і мэтах знешняй падтрымкі;
- праяўленасць беларускага парадку дня ў праграмах асноўных донараў, у публічнай прасторы замежных краін і ў палітыцы ў дачыненні Беларусі;
- ацэнка ўцягнутасці грамадзянскай супольнасці ў кансультацыі і прыняцце рашэнняў на міжнародным узроўні (ЕС, ЗША, краіны – чальцы ЕС, міжнародныя арганізацыі: Рада Еўропы, АБСЕ, парламенцкія інстытуты і г. д.).

*Перыяд, які ахоплівае даследаванне: з 2020 года да пачатку праекта, два зрэзы за час рэалізацыі праекта.*

## Заказчыкі даследавання і аўдыторыя, якой прэзентуюцца вынікі:

Борд і кіраўніцтва Beehive

BELARUS
BEEHIVE

## Вынікі і тэрміны падачы вынікаў

Аналітычная справаздача на 5-7 старонках (без уліку дадаткаў) даецца тройчы на працягу часу даследавання.

Першая справаздача пра тэндэнцыі за перыяд 2020–2024 гг. (тэрмін падачы – снежань 2024 г.);

другая справаздача пра тэндэнцыі за перыяд 2024–2025 гг. (тэрмін падачы – чэрвень 2025 г.);

трэцяя справаздача пра тэндэнцыі за перыяд 2025–2026 гг. (тэрмін падачы – травень 2026 г.).

## Справаздача мусіць змяшчаць наступныя раздзелы:

- Аб’ём і тэндэнцыі фінансавання па асноўных донарах. Раздзел мусіць уключаць аналіз таго, які быў узровень міжнароднай фінансавай дапамогі, вылучанай грамадзянскай супольнасці ў Беларусі за мінулы перыяд, ці зменшыўся ўзровень міжнароднай фінансавай дапамогі, вылучанай грамадзянскай супольнасці ў Беларусі за мінулы перыяд.

- Прыярытэты ў фінансаванні з боку міжнародных донараў, а таксама наколькі яны адпавядаюць праяўленым патрэбам і прыярытэтам саміх беларускіх арганізацый грамадзянскай супольнасці (АГС).

- Уплыў грамадзянскай супольнасці на прыняцце рашэнняў наконт міжнароднага фінансавання. Звесткі мусяць уключаць: на якія структуры спрабуюць уплываць, спосабы і фарматы ўплыву (удзел у мерапрыемствах адвакацыі або іх арганізацыя, распрацоўка policy paper, даследаванні, распрацоўка дарожных карт ды іншыя), колькасць міжнародных мерапрыемстваў, на якіх беларускія АГС мелі магчымасць паказаць ацэнку сваіх патрэб і стратэгіі (планы) дзейнасці, у тым ліку АГС, якія працягваюць сваю дзейнасць у Беларусі, а таксама колькі донараў прыцягваюць АГС да кансультацый любой формы (усё гэта за перыяд, які даследуецца).

- Рэкамендацыі кіраўніцтву праграмы, датычныя паляпшэння фарматаў і спосабаў уплыву і ўцягвання грамадзянскай супольнасці ў адвакацыю для міжнароднай дапамогі.

**Мова справаздачы:** *беларуская.*

## Метадалогія

Збор інфармацыі з адкрытых крыніц. Перапіска з афіцыйнымі структурамі. Правядзенне інтэрв’ю з прадстаўнікамі донарскіх арганізацый (з выкарыстаннем паўструктураванай анкеты) і АГС, якія сістэматычна займаюцца адвакацыяй. Першая справаздача – пра тэндэнцыі на 2020–2024 гады, другая – за 2024–2025 гады, трэцяя – за 2025–2026 гады.

## Разлік аб’ёму працы:

| Від працы | Выдаткі часу | Выдаткі часу агульныя, гадзіна |
|---|---|---|
| Збор інфармацыі з адкрытых крыніц | Прыкладна 10 донараў, 3 гадзіны на донара ў год | 30 |
| Звароты ў афіцыйныя інстытуцыі | 10 запытаў, 2 гадзіны на запыт | 20 |
| Інтэрв’ю | 10 інтэрв’ю, 5 гадзін | 50 |
| Складанне спісу пытанняў для інтэрв’ю | 5 гадзін | 5 |
| Падрыхтоўка аналітычнай справаздачы | 20 гадзін | 20 |

*У выніку: 215 гадзін для падрыхтоўкі аналітычнай справаздачы за 2020–2024 гады. 120 – для справаздачы за 2024–2025, 2025–2026 гады.*

**Патрабаванні да выканаўцаў**

Запрашаюцца групы экспертаў або індывідуальныя эксперты, якія маюць:

- Кваліфікацыі ў сферы сацыяльна-гуманітарных навук;
- Пацверджаны досвед навукова-даследчай дзейнасці ў сацыяльна-палітычнай сферы;
- Пры знаходжанні эксперта ў Беларусі ў мэтах бяспекі спатрэбіцца верыфікацыя і праверка асобы.

Патэнцыйныя выканаўцы могуць дасылаць свае заяўкі на адрас: research.procurement@belarusbeehive.eu

Заяўка мусіць утрымліваць: рэзюмэ (індывідуальнае або групы экспертаў) і прапанаваны бюджэт даследавання.

*Апошні тэрмін падачы заявак:* **9 верасня 2024 г.**

BELARUS BEEHIVE